# МОВОЗНАВСТВО ● LINGUISTICS

УДК 811.161.3'373.46:69
https://doi.org/10.31499/2415-8828.1.2021.232601

**Таццяна Бабровіч***

## ЗАКАНАМЕРНАСЦІ НАМІНАЦЫІ СУБСТАНТЫЎНЫХ НАЙМЕННЯЎ БУДАЎНІЧАЙ СФЕРЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У артыкуле разглядаюцца вытворныя найменні будаўнічай сферы з пункту погляду анамасіялогіі. На аснове сабранага моўнага матэрыялу былі вылучаны некалькі тыпаў моўных адзінак: акцыянальны, аб'ектны, лакатыўны, кваліфікацыйны. Зроблены вывады, што для кожнага тыпу намінацыі характэрны свае словаўтваральныя мадэлі і дэрывацыйныя сродкі. Аналіз паказаў, што самай шматлікай з'яўляецца акцыянальны тып найменняў будаўнічай сферы, у якім прадстаўлены ўсе спосабы намінацыі.

**Ключавыя словы**: найменні будаўнічай сферы; анамасіялогія; намінацыя; спосабы намінацыі; тып намінацыі; марфемная дэрывацыя; семантычная дэрывацыя; сінтаксічная дэрывацыя.

**Babrovich Tatsiana. Regularities of nomination of substantive names of the construction sphere in the modern Belarusian language**.

Onomasiology occupies one of the important places among the sciences that study the lexical and semantic level of language, as it studies both the problems of formation of language nominations and the nominations themselves – the result of these processes. The process of naming, which is the subject of nomination theory, is a complex thought and speech process, which distinguishes several stages: the stage of isolation by consciousness of the object to be named, comprehension of the denoted and the choice of adequate linguistic means of naming. In this regard, of particular interest are derived names in which it is possible to establish onomasiological structure. Onomasiological analysis of nominative units allows to record the features of nominative human activity. Observations show that such an analysis is applicable to derivatives of universes (monosyllabic names), which are formed in different ways, biverbal and polyverbal names.

An important issue in modern onomasiology is the study of the types of nominations that are formed on the basis of motivated features, and their relationship with the methods of nomination. The study aims to identify the features of these relationships within the considered thematic subgroups. Taking into account the developed typologies in this work, an attempt is made to consider the onomasiological structure of the names of the construction industry and to isolate the types according to the nature of the onomasiological feature. It is possible to distinguish onomasiological feature for each derived name by reproducing the nominative judgment.

Among the noun building terminological units, nominations belonging to the promotional type, object type, locative type and qualifying type were singled out. In addition, in the action type there are action-object and adjective-action subtypes. Types and subtypes are considered in connection with nomination methods where derivational means play an important role. The account of affixes allows to correlate language units with character of an onomasiological sign and to establish, what on value of group of subject names have arisen by means of this or that sign and what derivational means are used as bases at these signs.

**Keywords:** names of construction sphere; onomasiology; nomination; methods of nomination; type of nomination; morpheme derivation; semantic derivation; syntactic derivation.

Анамасіялогія займае адно з важных месцаў сярод навук, якія даследуюць лексіка-семантычны ўзровень мовы, так як вывучае праблемы ўтварэння моўных

* **Таццяна Бабровіч**, старшы выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка (Мінск, Рэспубліка Беларусь); e-mail: tanyabobrovich@yandex.ru.

намінацый, самі намінацыі – вынік гэтых працэсаў. Працэс называння, які з'яўляецца прадметам тэорыі намінацыі, уяўляе сабой комплексную мыслёвую і маўленчую з'яву, у якой выдзяляюць некалькі этапаў: этап вычлянення свядомасцю аб'екта, які трэба назваць, асмысленне абазначаемага і выбар адэкватных моўных сродкаў наймення. У сувязі з гэтым пэўную цікавасць уяўляюць вытворныя найменні, у якіх магчыма ўстанавіць анамасіялагічную структуру. Анамасіялагічны аналіз намінатыўных адзінак дазваляе зафіксаваць асаблівасці намінатыўнай дзейнасці чалавека. Як паказваюць назіранні, такі аналіз прымянімы да вытворных універбаў (аднаслоўных найменняў), якія ўтвораны рознымі спосабамі, бівербальных і полівербальных найменняў.

Актуальным пытаннем сучаснай анамасіялогіі з'яўляецца вывучэнне тыпаў намінацыі, якія фарміруюцца на аснове матываваных прыкмет, і іх суадносіны са спосабамі намінацыі. Аналіз вытворных моўных адзінак накіраваны на выяўленне асаблівасцей гэтых адносін унутры разгледжаных тэматычных падгруп.

Аб'ектам нашага даследавання з'явіліся 3287 (3016 з'яўляюцца вытворнымі адзінкамі) субстантыўныя намінацыяйныя адзінкі, якія ўваходзяць у тэматычныя падгрупы «Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы», «Будынкі, памяшканні», «Будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы». Крыніцамі моўнага матэрыялу сталі пяцітомны «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (пад рэд. К. Атраховіча, 1977–1984), двухтомны «Русско-белорусский политехнический словарь» (пад рэд. І. Бурак, 1998), «Современный русско-белорусский политехнический словарь» (склад. А. Булыка, 1997−1998), «Русско-белорусский словарь по основам строительного дела» (склад. П. Бабарыка, 1994), «Руска-беларускі навукова-тэхнічны слоўнік» (склад. А. Савіцкая, 2010), «Слоўнік новых слоў беларускай мовы» (склад. В. Уласевіч, Н. Даўгулевіч, 2009), «Слоўнік тэрмінаў. Архітэктура, выяўленчае мастацтва і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (склад. Б. Лазука, 2001), а таксама асобныя выданні, прысвечаныя будаўніцтву.

З улікам распрацаваных тыпалогій у дадзенай працы робіцца спроба разгляду анамасіялагічнай структуры найменняў будаўнічай сферы і вычлянення тыпаў паводле характару анамасіялагічнай прыкметы. Вылучыць анамасіялагічную прыкмету магчыма для кожнага вытворнага наймення шляхам узнаўлення намінатыўнага суджэння. Т. Трафімовіч у працы, прысвечанай старарускай прадметнай намінацыі, выдзяляе як найбольш тыповыя *агентыўную*, *аб'ектную*, *лакатыўную*, *пасесіўную* і *нумеральна-тэмпаральную* прыкметы [Трофимович 2003, с. 50].

Так, сярод субстантыўных будаўнічых тэрміналагічных адзінак былі вылучаны намінацыі, якія належаць да *акцыянальнага тыпу*, *аб'ектнага тыпу*, *лакатыўнага тыпу* і *кваліфікатыўнага тыпу*. Акрамя гэтага, у акцыянальным тыпе выдзяляюцца *акцыянальна-аб'ектны* і *ад'ектыўна-акцыянальны падтыпы*. Тыпы і падтыпы разглядаюцца ў сувязі са спосабамі намінацыі, дзе важную ролю адыгрываюць дэрывацыйныя сродкі. Т. Трафімовіч падкрэслівае, што афіксы з'яўляюцца спосабам эксплікацыі анамасіялагічнага базісу і выражаюць катэгарызацыйную дзейнасць моўнай асобы пры намінацыі прадметаў навакольнай рэчаіснасці. Улік гэтых афіксаў дазваляе суаднесці іх з характарам анамасіялагічнай прыкметы і ўстанавіць, якія паводле значэння групы прадметных найменняў узніклі з дапамогай той ці іншай прыкметы і якія дэрывацыйныя сродкі выкарыстаны ў якасці базісаў пры гэтых прыкметах [Трофимович 2003, с. 39].

Заканамернасці намінацыйных працэсаў тэрміналагічных найменняў будаўнічай сферы ў тэматычных падгрупах «Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы», «Будынкі, памяшканні», «Будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы» адлюстраваны ў табліцы (Табліца 1).

Табліца 1

**Тыпы і спосабы намінацыі найменняў будаўнічай сферы сучаснай беларускай мовы**

| Тып намінацыі | Спосаб намінацыі | | | Агульная колькасць найменняў |
|---|---|---|---|---|
| | Марфемная дэрывацыя | Семантычная дэрывацыя | Сінтаксічная дэрывацыя | |
| *Акцыянальны тып* | 266 | 45 | 387 | 1219 (37 %) |
| *Аб'ектны-акцыянальна падтып* | 21 | – | 272 | |
| *Ад'ектыўна-акцыянальны падтып* | – | – | 228 | |
| *Аб'ектны тып* | 173 | 7 | 615 | 795 (24 %) |
| *Лакатыўны тып* | 50 | 6 | 540 | 596 (18 %) |
| *Кваліфікацыйны тып* | – | 15 | 395 | 405 (12 %) |

Разгледзім тыпы намінацыі і характэрныя для іх спосабы намінацыі, а таксама дэрывацыйныя сродкі.

**І. Акцыянальны тып намінацыі.**

*Акцыянальная анамасіялагічная прыкмета* ўказвае на паняційную суаднесенасць з катэгорыяй працэсуальнасці, г. зн. дазваляе ўстанавіць, што ў аснове намінацыі ляжыць паняцце дзеяння. Як адзначае У. Гак, «сістэма намінацый дзеяння ў мове ўтварае расплывістую множнасць, дзе ядзернай структурай з'яўляецца дзеясловў» [Гак 1998, с. 452].

Акцыянальны тып намінацыі актыўна рэалізуецца праз *спосабы* ***марфемнай дэрывацыі***, найбольш практуктыўнымі з якіх з'яўляюцца:

1) *суфіксальная мадэль* утварэння аддзеясловўных дэрыватаў з суфіксам ***-льнік***, якія ўваходзяць у тэматычныя падгрупы «Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы», «Будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы» і маюць абагуленае значэнне прадмета (матэрыяла ці рэчыва), звязанага з пэўным працэсам: *ахаладжальнік, запаўняльнік, напаўняльнік, ушчыльняльнік, паглынальнальнік, уцяпляльнік* і інш.

Пры аналізе вылучаны найменні будаўнічай сферы з суфіксам ***-льн(я)***, якія адносяцца да тэматычнай падгрупы «Будынкі, памяшканні» і атрымалі сваю назву паводле дзеяння, якое ў іх адбываецца: *брадзільня, парыльня, гартавальня, спальня, часальня* і інш.

Паняційную сувязь з дзеяннем магчыма прасачыць у будаўнічых найменнях з суфіксамі ***-арн(я)*** − *друкарня, пякарня*; ***-оўк(а)*** – *кладоўка*; – ***цейн(я)***; ***-ынак*** – *будынак*; ***-лярн(я)*** – *вяндлярня*; ***-н(я)*** – *пільня*; ***-ішч(а)*** – *сховішча*; – ***ятар*** – *ізалятар*; ***-нн(е)*** – *збудаванне*; ***-лл(ё)*** – *жыллё* і інш.

Аднаслоўныя (універбальныя) адзінкі акцыянальнага тыпу, якія ўваходзяць у тэматычную падгрупу «Будаўнічыя канструкцыі, часткі і элементы» ўтварыліся з выкарыстаннем суфіксаў ***-цц-*** (*перакрыццё, пакрыццё*), ***-ін(а)***, (*перакладзіна, адтуліна, свідравіна, выбоіна*), ***-ак (-як)*** (*абрэзак, стаяк,*

*абпілак, абрубак, падмурак, прымурак*), ***-яцы(я)*** (*вентыляцыя, ізаляцыя*); ***-ыш*** (*укладыш*). Суфікс *-л-* адзначаны ў аддзеяслоўным назоўніку *бялілы*, які адносіцца да тэматычнай падгрупы «Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы».

Пры аналізе былі вылучаны адзінкі *акцыянальнага тыпу* з *нулявым суфіксам* са значэннем выніку дзеяння, якія ўваходзяць ва ўсе аналізуемыя тэматычныя падгрупы: *сумесь, раствор, замес, расплаў, вар, распіл, накат, падмес*; *склад, пабудова, забудова, прыбудова, надбудова, мур*; *зліў, зруб, звод, лаз, закот, падвес, насціл, стык, пралёт, пераплёт, сцёк, сток, выступ, выхад, праход, падруба, падпор, уваход* і інш.

А. Кубракова адзначае, што «паколькі дэрывацыйныя элементы ў безафіксальнай транспазіцыі адсутнічаюць, змена семантыкі вытворнай асновы ў параўнанні з утваральнай можа быць ацэнена як замена аднаго катэгарыяльнага значэння другім. Менавіта гэта і дазваляе упэўніцца ў тым, што семантыка асобнай часціны мовы мае ярка выражаны “паняційны” характар і што ў яе аснове ляжыць тая ці іншая анамасіялагічная катэгорыя» [Кубрякова 2016, с. 80];

2) асобнае месца сярод акцыянальных адзінак, якія ўтвораны ў выніку марфемнай дэрывацыі, займаюць *кампазітныя найменні*. Пры спалучэнні дзвюх і больш паўназначных адзінак, на думку А. Кубраковай, утвараецца новае найменне, канкрэтнае значэнне якога ўзнаўляецца пры ўстанаўленні адносін паміж злучанымі знакамі [Кубрякова 2016, с. 64]. Па словах М. Міхалевіч, «характэрнай прыкметай складанага слова з’яўляецца аб’яднанне ў рамках цэльнааформленай адзінкі намінацыі дзвюх і больш семантычна маркіраваных катэгорый» [Михалевич 2017, с. 36]. У сувязі з гэтым у *акцыянальным тыпе* найменняў можна выдзеліць падтыпы, у прыватнасці, *акцыянальна-аб’ектны падтып*, у якім дзеянне адбываецца ў адносінах да аб’екта. Такія тэрміны ўваходзяць ва ўсе тэматычныя падгрупы: *гукапаглынальнік, вільгацепаглынальнік, водаразмеркавальнік* (*асновасклад. + суф. – льнік-*); *васкабойня, саляварня, фарбаварня* (*асновасклад. + суф. -н-*); *вадазбор, дымаход, водаправод, паветраадвод* (*асновасклад. + суф. -Ø-*); *водаадстойнік, водапрыёмнік* (*асновасклад. + суф. -нік-*) і інш.

Прадуктыўным спосабам утварэння будаўнічых найменняў акцыянальнага тыпу з’яўляецца ***сінтаксічная дэрывацыя***. Акцыянальная прыкмета непасрэдна звязана з дзеясловам як сродкам абазначэння паняцця дзеяння і рэалізуецца ў групе ***бівербальных (неаднаслоўных) найменнях*** будаўнічай сферы. Як адзначае Л. Мінакова, «комплексная намінацыя з’яўляецца адным з асноўных і найбольш прадуктыўных спосабаў стварэння намінатыўных адзінак у навукова-тэхнічнай тэрміналогіі. Гэта абумоўлена імкненнем тэрміналогіі да строгай і дакладнай дыферэнцыяцыі паняццяў, калі межы аднаслоўнага тэрміна аказваюцца вузкімі, а словаўтваральныя магчымасці афіксаў абмежаванымі» [Мінакова 2004, с. 47]. Для вызначэння ў бівербальных адзінках акцыянальнай прыкметы аналізавалася семантыка атрыбутыўнага кампанента, устанаўлівалася яго сувязь з дзеясловам. Па словах Т. Трафімовіч, можна «лічыць адзінкамі, якія маюць агентыўную матывацыю, тыя, у якіх атрыбутыўны кампанент звязаны з назвай і паняццем дзеяння» [Трофимович 2003, с. 52]. У выніку чаго былі вылучаны бівербальныя найменні акцыянальнага тыпу, якія ўваходзяць ва ўсе названыя тэматычныя падгрупы.

Атрыбутыўны кампанент, які вылучаецца ў складзе бівербальных тэрміналагічных адзінак, можа перадаваць значэнне прыкметы прадмета ці яго якасці. Напрыклад, *шпона* ***пераклееная***, *шпона* ***струганая***, *шпона* ***пілаваная***;

*цэмент* ***плаўлены***, *цэмент* ***змешаны***; *цвік* ***рэзаны***, *цвік* ***кованы***; *цэлафан* ***лакіраваны***; *кераміка* ***паліваная***; *медзь* ***асаджаная***; *кардон* ***арміраваны***; *цэгла* ***абпаленая***, *цэгла* ***прэсаваная***; *метал* ***пракатаны***; *перліт* ***успучаны*** і інш.

У другіх выпадках атрыбутыўны кампанент можа ўказваць на канкрэтнае прызначэнне: *бялілы* ***крыючыя***; *лак* ***ахоўны***; *масціка* ***герметызуючая, залівачная, прыклейваючая;*** *абмазка* ***ахоўная;*** *паста* ***герметызуючая, ушыльняльная;*** *пігмент* ***фарбавальны***; *слой* ***ахоўны***, ***абліцовачны*** і інш.

Паколькі ў назве, акрамя самога паняцця дзеяння, актуалізуюцца і прыкметы дзеяння, у акцыянальным тыпе найменняў можна выдзеліць пэўныя падтыпы, у прыватнасці, *ад'ектыўна-акцыянальны*, да якога адносяцца, напрыклад, такія бівербальныя тэрміны з састаўным атрыбутыўным кампанентам, як *бялілы* ***густацёртыя***; *бетон* ***хуткасхоплівальны, высокатрывалы***, ***гарачастойкі***, ***хуткацвярдзеючы***; *вапна* ***хуткагасільная, павольнагасільная***; *фарба* ***хуткавысыхаючая***; *лак* ***самаацвярджальны***; *цэмент* ***высокатрывалы***; *перакрыццё* ***свабодналяжачае***; *панэль* ***саманясучая***; *сцяна* ***саманясучая***; *будынак* ***хуткаўзведзены*** і інш.

Атрыбутыўны кампанент біверба можа змяшчаць звесткі і на ўказанне дзеяння, якое адбываецца ў адносінах да пэўнага аб'екта. Таму мы выдзяляем *аб'ектна-акцыянальны* падтып у бівербальных адзінках. Напрыклад, *змазка* ***марозастойкая***; *смала* ***водарастваральная***, ***масларастваральная***; *гума* ***смоланапоўненая***, ***электраправодзячая***; *шкло* ***вогнетрывалае***, ***цеплаахоўнае, цеплапаглынаючае***; *фанера* ***вадастойкая***; *слой* ***водапранікальны, гідраізалюючы***; *сталь* ***холадаўстойлівая***; *тынк* ***газанепранікальны*** і інш.

Да акцыянальнага тыпу адносяцца субстантыўныя тэрміналагічныя адзінкі будаўнічай сферы, утвораныя ў выніку ***семантычнай дэрывацыі***.

Шляхам *метафарычнага* пераносу ўтвораны найменні, якія змяшчаюць інфармацыю аб аднолькавым функцыянальным прызначэнні. Як адзначае В. Старычонак, «функцыянальнае прызначэнне прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці, іх ролевая нагрузка служыць, з аднаго боку, сродкам іх дыферэнцыяцыі, а з другога – сродкам іх інтэграцыі. Па аднолькавых (ці падобных) дзеяннях і функцыях у адзін клас аб'ядноўваюцца самыя разнастайныя рэаліі (як падобныя па вонкавым выглядзе, так і абсалютна розныя)» [Старычонак 2017, с. 128].

Пры аналізе моўнага матэрыялу былі вылучаны наступныя намінацыі, якія матывуюцца ***функцыяй*** агульнаўжывальных слоў: ***нага*** "адна з дзвюх ніжніх канечнасцей чалавека" і "апора, ніжняя частка мэблі, пабудовы"; ***адзенне*** "вырабы з тканіны, футра і пад., якія надзяюць на сябе" і "спец. пакрыццё праезджай часткі дарогі, вуліцы, абліцоўка буданкаў"; ***кажух*** "доўгая верхняя вопратка з выробленых аўчын" і "пакрыццё, футляр з жалеза, цэглы, дрэва і пад. для ізаляцыі або засцярогі збудаванняў, механізмаў ці іх частак"; ***шпілька*** "прыстасаванне з тонкага дроту або пластмасы для заколвання валасоў у жаночай прычосцы; засцежка для вопраткі, адзін канец якой хаваецца ў кручкападобнае паглыбленне (галоўку)" і "спец. стрыжань без галоўкі і з разьбой на абодвух канцах, які служыць для змацавання дэталяў" і інш.

Акцыянальны тып рэалізуецца ў шэрагу будаўнічых найменняў, прадстаўленых семантычнымі дэрыватамі, утворанымі шляхам *метанімічнага пераносу* па мадэлі "*назва дзеяння – назва выніку дзеяння прадмета, пры дапамозе якога гэта дзеянне ажыццяўляецца)*": ***абліцоўка*** "дзеянне паводле знач. дзеясл. абліцоўваць – абліцаваць" і "слой будаўнічага матэрыялу, які

пакрывае паверхню асноўнага матэрыялу (для трываласці і прыгажосці)"; ***ацынкоўка*** "дзеянне паводле знач. дзесл. ацынкоўваць – ацынкаваць" і "тонкі слой цынку, нанесены на паверхню металу, металічнага вырабу"; ***замазка*** "дзеянне паводле дзеясл. замазваць – замазаць" і "вязкае рэчыва для замазвання шчылін"; *заклёпка* "дзеянне паводле знач. дзеясл. заклёпваць – закляпаць і "металічны шпень з шырокай галоўкай на адным канцы, прызначаны для замацавання металічных частак чаго-н."; ***расцяжка*** "дзеянне паводле дзеясл. расцягваць – расцягнуць" і "стальны трос або дрот, які захоўвае што-н. у пэўным становішчы".

**II. Аб'ектны тып намінацыі.**

У субстантыўных тэматычных падгрупах найменняў будаўнічай сферы выдзяляецца група намінацый ***аб'ектнага тыпу.*** У філасофіі *аб'ектам* з'яўляецца «тое, што супрацьпастаўлена суб'екту ў яго прадметна-практычнай і пазнавальнай дзейнасці, гэта частка аб'ектыўнай рэальнасці, якая знаходзіцца ва ўзаемадзеянні з суб'ектам» [Лингвистический словарь 1990, с. 453]. У анамасіялагічных даследаваннях «паняцце аб'екта выходзіць за межы лінгвістычнага зместу», пад *аб'ектам* разумеецца «любы прадмет навакольнага свету, рэалія аб'ектыўнай рэчаіснасці, даная суб'екту пры адчуванні і ўспрыняцці» [Трофимович 2003, с. 75]. Такім чынам, можна гаварыць пра тэрміналагічныя найменні аб'ектнага тыпу, калі магчыма ўстанавіць сувязь у працэсе намінацыі паміж прадметам і іншым аб'ектам навакольнага свету, што прыводзіць да рэалізацыі ***аб'ектнай прыкметы***. Калі ў аснову намінацыі прадмета пакладзена аб'ектная прыкмета, значыць у акце намінацыі з'яўляецца тое, што звязвае названы прадмет з іншым аб'ектам.

Да аб'ектнага тыпу адносяцца ***марфемныя дэрываты***. Так, у тэматычную падгрупу «Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы» ўваходзяць універбальныя тэрміналагічныя намінацыі з суфіксам ***-іт(-ыт)***: *чараціт, бетаніт, асфальтыт, азбестыт* і інш. Па словах А. Земскай, ён «дае вытворныя ад назваў іншых рэчываў, ад уласных імёнаў, месца здабычы, знаходжання і інш.» [Земская 1992, с. 144], а значыць відавочная сувязь наймення з іншым аб'ектам навакольнага свету.

Тэрміналагічныя найменні тэматычнай падгрупы «Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы» з суфіксам ***-ік-*** (*пясчанік, галечнік, ракушачнік, піловачнік*) указваюць на сувязь назвы прадмета і матэрыяла, з якога ён зроблены ці ў прадмеце змяшчаецца. Параўн., *галечнік* "горная парода, якая складаецца з рачной або марской галькі"; *пясчанік* "асадкавая горная парода, змацаваны вапнай і глінай пясок, які ўжываецца ў будаўніцтве"; *ракушачнік* "порыстая карбанатная горная парода, якая складаецца з ракавін марскіх жывёл, змацаваных вапняковым ілам" і інш. Намінатыўныя адзінкі з суфіксам ***-як-*** (*вапняк, жалязняк, плітняк*) атрымалі свае назвы паводле мінералаў і хімічных элементаў: *вапняк* "асадкавая горная парода, якая мае ў сабе вапну"; *жалязняк* "жалезная руда"; *плітняк* "вапняковая або пясчаная парода, якая лёгка раздзяляецца на пліты".

Найменні аб'ектнага тыпу вылучаны ў тэматычнай падгрупе "Будынкі, памяшканні" з наступнымі суфіксамі: ***-н(а)*** (*алейня, апарня, бандарня, канюшня, слясарня, кацельня*); ***-арн(я)*** (*малачарня, аўчарня, кнігарня, такарня*); ***-нік*** (*кароўнік, птушнік*), ***-арнік*** (*свінарнік*), ***-оўн(я)*** (*саладоўня*) і інш. Будынкі і памяшканні атрымалі сваю назву паводле таго, што ў іх змяшчаецца, захоўваецца ці вырабляецца.

Сярод тэрміналагічных намінацый аб'ектнага тыпу адзначаны *кампазіты* ва ўсіх тэматычных падгрупах, якія ўтварыліся шляхам *аснова-* і *словаскладання*: *жалезабетон, гель-цэмент, газагіпс, газашкло, шкловалакно, партландцэмент, стальбетон, пенькавалакно, лесаматэрыял, грунтлак, пенапласт, пенагума, ксілабетон*; *бензасховішча, гразелячэбніца*.

Пры ***сінтаксічнай дэрывацыі*** ў бівербальных адзінках атрыбутыўны (залежны) кампанент паказвае на сувязь прадмета рэчаіснасці з іншым прадметам у навакольным асяроддзі. Бівербальныя найменні аб'ектнага тыпу былі вылучаны ва ўсіх аналізаваных тэматычных падгрупах.

Сярод тэрміналагічных словазлучэнняў, якія ўваходзяць у тэматычную падгрупу «Будаўнічых матэрыялы і рэчывы» зафіксаваны намінацыі з аб'ектнай матывацыяй, якія атрымалі сваю назву ў залежнасці ад кампанента, што ўваходзіць у іх склад, і прызначэння: *бялілы* ***свінцовыя***, *бялілы* ***цынкавыя***; *бетон* ***барытавы***, *бетон* ***вапнавы***, *бетон* ***пясчаны***; *папера* ***шкляная***, *папера* ***свінцовая***; *вата* ***металічная***, *вата* ***азбеставая***; *валакно* ***драўнянае***, *валакно* ***базальтавае***, *валакно* ***цэлюлознае***, *валакно* ***азбеставае***; *брус* ***бардзюрны***, *брус* ***вільчыкавы***; *цвік* ***бэлечны***, *цвік* ***дахавы***, *цвік* ***паркетны***, *цвік* ***кроквенны*** і інш.

У бівербах тэматычнай падгрупы «Будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы» анамасіялагічная прыкмета ўказвае на матэрыял, з якога што-небудзь зроблена, і прызначэнне: *арматура* ***металічная***, *арматура* ***драцяная***; *каркас* ***драўляны***, *каркас* ***металічны***; *арматура* ***мантажная***; *болт* ***падмуркавы***; *блок* ***аконны***, *блок* ***сценавы***; *вушак* ***дзвярны***, *вушак* ***аконны***; *калодзеж* ***каналізацыйны***; *апора* ***анкерная***, *апора* ***бетонная***; *сцяна* ***цагляная***; *стойка* ***драўляная*** і інш.

Аб'ектны тып матывацыі адзначаны ў тэрміналагічных намінацыях, якія ўваходзяць у тэматычную падгрупу «Будынкі, памяшканні»: *фабрыка* ***бісквітная***, *фабрыка* ***калбасная***, *фабрыка* ***шпалерная***, *фабрыка* ***паркетная***; *камбінат* ***вугальны***, *камбінат* ***цэлюлозна-папяровы***; *завод* ***цукровы***; *кладоўка* ***інструментальная***, *кладоўка* ***правізійная***; *дом* ***панэльны***, *дом* ***драўляны***, *дом* ***галерэйны***; *збудаванне* ***спартыўнае*** і інш.

Аб'ектны тып намінацыі рэалізуецца таксама ў ***семантычных дэрыватах***, утвораных шляхам метанімічнага пераносу па мадэлях: ***назвы матэрыялу – назвы вырабу з гэтага матэрыялу***: *бяроза* "лісцевае дрэва сямейства бярозавых з белай карой" і "драўніна гэтага дрэва; матэрыял", *жалеза* "хімічны элемент, цяжкі коўкі метал серабрыстага колеру, які ў спалучэнні з вугляродам утварае чыгун і сталь" і "звычайная (бытавая) назва малавугляродзістых сталей; вырабы з гэтага металу"; *сурык* "мінерал, у склад якога ўваходзіць свінец' і 'мінеральная фарба чырвона-аранжавага колеру"; ***назва механізма (прыстасавання) – назва будынка*, дзе *знаходзіцца гэты механізм (прыстасаванне)***: *млын* "машына для здраблення розных матэрыялаў, якая выкарыстоўваецца ў горнай, хімічнай і інш. галінах прамысловасці" і "прадпрыемства, на якім мелюць збожжа; будынак з установленымі ў ім прыстасаваннямі для размолу збожжа".

**III. Лакатыўны тып намінацыі.**

Прастора з'яўляецца адной з базавых катэгорый аб'ектыўнай рэчаіснасці і адыгрывае асаблівую ролю ва ўспрыманні свету чалавекам. Прастора як неабмежаваная працягласць у трох вымярэннях і адна з форм існавання матэрыі разглядаецца перш за ўсё фізікамі і філосафамі. У лінгвістычнай літаратуры не існуе адзінага тэрміна для абазначэння найменняў месца. У большасці

спецыяльных прац можна сустрэць тэрмін *“лакатыў, лакатыўны”* ў значэнні *“назва месца”*. Пад паняццем месца разумеецца «прастора, якая занята кім-чым-н., на якой што-небудзь адбываецца, знаходзіцца або дзе можна размясціцца; участак зямной паверхні» [Ожегов, Шведова 1999, с. 352]. Аналізуючы лакатыўныя найменні, Т. Трафімовіч слушна заўважае, «шырата паняцця месца не можа перашкаджаць выяўленню лакатыўнага кампанента ў семантыцы наймення. Гэты кампанент выяўляецца пры аналізе намінатыўнага суджэння, характара выкарыстаных дэрывацыйных сродкаў» [Трофимович 2003, с. 132].

Да лакатыўнага тыпу адносяцца ***марфемныя дэрываты*** будаўнічай сферы, у якіх аналіз семантыкі дае магчымасць убачыць лакатыўную прыкмету. Напрыклад, *падаконнік (пад- + аснова назоўн. + -нік)* “дошка або каменная пліта, устаўленая ці ўмураваная гарызантальна ў аконны праём знізу”; *падстрэшак (па- + аснова назоўн. + -ак)* “ніжні край страхі, які навісае над сцяною якога-н. будынка”; *падпятнік (пад- + аснова назоўн.+ -ік)* “спец. прыстасаванне для апоры восі вертыкальнага вала”; *прасценак (пра- + аснова назоўн. + -ак)* “частка сцяны паміж аконнымі ці дзвярнымі праёмамі’; *наканечнік (на- + аснова назоўн. + -нік)* ‘невялікі, звычайна конусападобны прадмет, які насаджваецца на канец іншага прадмета”; *навугольнік (на- + аснова назоўн. + -нік)* “накладка, звычайна металічная, якая служыць для замацавання або аздаблення вуглоў (рамы, скрыні і пад.)”; *міжаконне (між- + аснова назоўн. + Ø (е))* “частка сцяны паміж аконнымі праёмамі”; *прыступка (пры- + аснова дзеясл. + -к (а))* “падножка, ступенька, па якіх падымаюцца ўверх або спускаюцца ўніз” і інш.

Аналіз сабранага матэрыялу паказвае, што найбольш актыўна ў працэсе ўтварэння найменняў лакатыўнага тыпу выкарыстоўваецца ***сінтаксічная дэрывацыя***. Неаднаслоўныя лакатыўныя найменні зафіксаваны ў трох аналізаваных падгрупах.

Пэўную групу лакатыўных адзінак складаюць бівербы, у якіх атрыбутыўны кампанент паказвае на месцазнаходжанне ў прасторы без указання на канкрэтнае месца: *бабка* ***пярэдняя***; *башмак* ***унутраны***, *башмак* ***вонкавы***; *блок* ***пярэдні***; *галерэя* ***вонкавая***; *дзверы* ***бакавыя***, *дзверы* ***ўваходныя***, *дзверы* ***заднія***, *дзверы* ***вонкавыя***; *дошка* ***бакавая***; *карніз* ***прамежкавы***; *камень* ***вуглавы***; *цэгла* ***вонкавая***; *кант* ***верхні***; *насціл* ***ніжні***; *панэль* ***пярэдняя***; *сцяна* ***бакавая***.

У некаторых неаднаслоўных найменнях лакатыўнага тыпу атрыбутыўны кампанент указвае на канкрэтнае месца: *шчэбень* ***кар’ерны***; *пясок* ***кар’ерны***; *паверх* ***антрэсольны***, *паверх* ***цокальны***, *паверх* ***падвальны***; *элемент* ***фасадны***; *сцяна* ***тарцовая***, *сцяна* ***фасадная***, *сцяна* ***франтонная***; *бабка* ***падкроквенная***, *бабка* ***падмуркавая***; *збудаванне* ***падземнае***; брус ***вільчыкавы***; *жолаб* ***дахавы***.

Вылучаны асобныя найменні лакатыўнага тыпу, утвораныя шляхам ***семантычнай дэрывацыі*** па мадэлі – *назва месца – назва збудавання*: *база* “апорны пункт, месца, дзе засяроджаны якія-н. запасы, маюцца асобныя збудаванні і ўстаноўкі для абслугоўвання чаго-н.” і “склад тавараў, матэрыялаў”.

**IV. Кваліфікацыйны тып намінацыі.**

Кожны аб’ект валодае шэрагам прыкмет, адзін з якіх кладзецца ў аснову пры яго называнні. Часцей за ўсё гэта адбываецца ў найменнях, дзе ў аснову намінацыі закладзены кваліфікацыйныя прыкметы, а якасць ці ўласцівасць анамасіялагічнай прыкметы выражаецца непасрэдна значэннем асновы слова-прыкметы. Аб гэтым даволі падрабязна пісаў В. Вінаградаў. Ён прапанаваў вылучыць групы прыметнікаў, якія называюць колер, прасторавыя і часавыя якасці, знешнія і фізічныя ўласцівасці, унутраныя якасці і г. д. [Виноградов 1972,

с. 153]. Па словах Н. Дзеруновай, «кваліфікацыйнымі можна лічыць прыкметы, якія характарызуюць прадметы праз іх прыналежнасць да якіх-небудзь груп, не аб'яднаных паняццем дзеяння, месца, аб'екта і іншых тыповых для разгледжаных найменняў прыкмет» [Дерунова 2015, с. 102]. Да кваліфікацыйнага тыпу адносяцца адзінкі, якія ў сваёй унутранай форме актуалізуюць інфармацыю аб фізічных якасцях аб'екта намінацыі. На думку Г. Ягафаравай, можна выдзеліць два тыпы матываў, у якіх у аснове намінацыі змяшчаецца прыкмета:

1) знешні выгляд аб'екта, г. зн. тое, што ўспрымаецца зрокам, дотыкам, а значыць важнымі аказваюцца ў працэсе намінацыі колер, форма, памер, велічыня, структура, фізічныя якасці і і інш.;

2) унутраныя якасці аб'екта, тое, што можна адчуваць праз органы пачуццяў, а значыць, важнымі аказваюцца пры намінацыі пах, смак, характар, манера паводзін і інш. [Ягафарова 2018, с. 33].

Так, будаўнічыя тэрміны кваліфікацыйнага тыпу вылучаны ва ўсіх прааналізаваных тэматычных падгрупах і прадстаўлены ***сінтаксічнымі дэрыватамі***. Невялікую групу складаюць бівербы тэматычнай падгрупы «Будаўнічыя матэрыялы, рэчывы», у якіх атрыбутыўны кампанент указвае на колер: *портландцэмент* ***белы***, *портландцэмент* ***каляровы***; *эмаль* ***белая***; *бляха* ***чорная***; *вапняк* ***белы***; *лінолеум* ***шматколерны***. У дадзенай тэматычнай падгрупе шырока прадстаўлены неаднаслоўныя найменні з атрыбутыўным кампанентам, які ўказвае на фізічныя якасці ці структуру матэрыялаў і рэчываў: *алюміній* ***грануляваны***; *бетон* ***порысты***, *бетон* ***ячэісты***, *бетон* ***слаісты***, *бетон* ***лёгкі***; *бітум* ***вязкі***, *бітум* ***рэдкі***, *бітум* ***мяккі***; *валакно* ***цвёрдае***, *валакно* ***эластычнае***, *валакно* ***тастаўсценнае***; *гіпс* ***валакністы***; *драўніна* ***буйнаслойная***.

У тэрміналагічных словазлучэннях, якія ўваходзяць у тэматычныя падгрупы «Будынкі, памяшканні», «Будаўнічыя канструкцыі, часткі, элементы» прыметнік указвае на форму ці памер аб'екта: *арка* ***кругавая***, *арка* ***паўцыркульная***, *арка* ***рашотчатая***, *арка* ***скразная***; *арматура* ***стрыжнёвая***; *дзверы* ***пустацелыя***; *дом* ***вышынны***, *дом* ***тыпавы***; *перакрыцце* ***плоскае***, *перакрыцце* ***рабрыстае***; *сцяна* ***ажурная***; *падмурак* ***плоскі***; *градзірня* ***секцыйная***; *купал* ***стральчаты***.

Бівербальныя найменні кваліфікацыйнага тыпу ўтвараюцца ў выніку ***семантычнай дэрывацыі***, калі адбываецца пераасэнсавання атрыбутыўнага кампанента. Напрыклад, *падлога* ***чорная*** (асаблівасці канструкцыі падлогі), *падлога* ***чыставая*** (асаблівасці канструкцыі падлогі); *дзверы* ***глухія*** (у якіх адсутнічаюць дэкаратыўныя элементы); *акно* ***глухое*** (акно, зробленае для формы, а не для карыстання); *сцяна* ***глухая*** (суцэльная сцяна без акон і дзвярэй); *бетон* ***тлусты*** (змяшчае вялікі працэнт цэменту ў сваёй структуры), *бетон* ***бедны*** (змяшчае нізкі працэнт цэменту ў сваёй структуры); *вапна* ***бедная*** (змяшчае ў сваёй структуры малы працэнт прымесей).

Такім чынам, на аснове анамасіялагічнага аналізу сабранага моўнага матэрыялу вылучаны наступныя тыпы будаўнічых субстантыўных найменняў: *акцыянальны тып*, *аб'ектны тып*, *лакатыўны тып* і *кваліфікацыйны тып*. У акцыянальным тыпе выдзяляюцца *акцыянальна-аб'ектны* і *ад'ектыўна-акцыянальны падтыпы*. Назвы тыпаў вызначыў характар анамасіялагічнай прыкметы, пакладзенай у аснову найменняў, а значыць, і характар паняццяў, выкарыстаных у якасці матывуючых пры ўзнікненні вытворных субстантыўных адзінак будаўнічай сферы. Сукупнасць тыпаў сведчыць аб тым, што значнымі пры намінацыі былі паняцце дзеяння (*акцыянальны тып*, *акцыянальна-*

*аб'ектны падтып, ад'ектыўна-акцыянальны падтып – 1219 адзінак*), паняцце аб'екта (*аб'ектны тып* – 795 адзінак), месца, прасторы (*лакатыўны тып* – 596 адзінак), разнастайныя ўласцівасці (колер, памер, форма і г. д.) (*кваліфікацыйны тып* – 405 адзінак). Кожны тып найменняў рэалізуецца праз словаўтваральныя мадэлі і пры дапамозе дэрывацыйных сродкаў.

**ЛІТАРАТУРА**


Виноградов, В. В. (1972). *Русский язык: Грамматическое учение о слове.* Москва, 616 с.

Гак, В. Г. (1998). *Языковые преобразования.* Москва, 768 с.

Дерунова, А. А. (2015). *Названия документов в русском деловом языке XI–XVII вв.: становление и развитие номинативной категории, типы наименований.* Дыс. ... канд. філал. навук. 10.02.01. Минск, 130 с.

Земская, А. А. (1992). *Словообразование как деятельность*. Москва, 220 с.

Кубрякова, Е. С. (2016). *Теория номинации и словообразования.* Москва, 86 с.

*Лингвистический энциклопедический словарь* (1990). В. Н. Ярцева (гл. ред.). Москва, 685 с.

Михалевич, М. М. (2017). *Типы композитных предметных наименований в русском и английском языках: ономасиологический аспект*. Дис. … канд. филол. наук. 10.02.20. Минск, 142 с.

Мінакова, Л. М. (2004). *Беларуская навукова-тэхнічная тэрміналогія: фарміраванне, функцыянаванне, развіццё.* Гомель, 146 с.

Ожегов, С. И. и Шведова, Н. Ю. (1999). *Толковый словарь русского языка*: 80000 слов и фразеол. выражений. Москва, 943 с.

Старычонак, В. Д. (2017). *Мнагазначнасць слова ў беларускай мове.* У 3 кн. Мінск, кн. 1, 273 с.

Трофимович, Т. Г. (2003). *Типы предметных наименований в языке старорусской деловой письменности.* Минск, 216 с.

Ягафарова, Г. Н. (2018). *Ономасиологический анализ лексики современного башкирского языка.* Автореф. дис. … д-ра филол. наук. Спец. 10.02.02 «Языки народов Российской Федерации (башкирский язык)». Казань, 49 с.



*Подано до редакції 09.04.2021 року*
*Прийнято до друку 05.05.2021 року*